ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987

4 ЧЭРВЕНЯ

ЧАЦВЕР

№ 20(1541)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП

*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### IV ПЛЕНУМ

камітэта камсамола універсітэта разгледзеў задачы камсамольскіх арганізацый Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна па рэалізацыі рашэнняў XX з'езда ВЛКСМ.

Пленум прыняў пастанову па абмеркаванаму пытанню. Намечана сканцэнтраваць намаганні камітэта камсамола універсітэта на аказанні канкрэтнай дапамогі камсамольскім арганізацыям факультэтаў. Бюро камітэта камсамола даручана разгледзець пытанне аб рабоце школы камсамольскага актыву; правесці падрыхтоўчую работу і актыўна ўдзельнічаць у рабоце гарадскога цэнтра НТТМ; наладзіць дакладную работу камітэта камсамола па прафесіянальнай арыентацыі вучняў.

Т. РУДКОЎСКАЯ.

### У КНІЖНЫМ КІЁСКУ

(галоўны корпус БДУ) маюцца ў продажы вучэбныя дапаможнікі для тых, хто паступае ў ВНУ.

А. СЦЯПАНАЎ.

### ФІЛЬМАТЭКА

універсітэта звяртае ўвагу ўсіх зацікаўленых, што ў гарадскую кантору кінапракату паступілі новыя кінафільмы.

В. ШУШКЕВІЧ.

### ЦІ БЫЛІ ВЫ

на Багамскіх астравах? Калі не, то маеце магчымасць атрымаць пуцёўку за мяжу па лініі БММТ «Спадарожнік» плюс грашовую прэмію. Для гэтага неабходна прыняць удзел у конкурсе (і — перамагчы!) на стварэнне новых канструкцый тэхнічных цацак з элементамі электронікі.

У конкурсе могуць прыняць удзел студэнты, маладыя выкладчыкі, навуковыя супрацоўнікі, інжынерна-тэхнічны персанал усіх структурных падраздзяленняў універсітэта індывідуальна ці калектыўна.

Узоры, прадстаўленыя на конкурс, павінны адлюстроўваць сучасныя дасягненні ў распрацоўцы электронных, электрамеханічных сістэм, быць прыгожымі, надзейнымі ў эксплуатацыі, адпавядаць патрабаванням тэхнікі бяспекі і санітарнай гігіены.

За больш дакладнай даведкай звяртацца ў камітэт камсамола (пакой 306).

Вынікі конкурсу будуць падводзіцца да 25 лістапада 1987 года.

Ж. КРУГЛІКАВА.

## мы — інтэрнацыяналісты



### «Я вучуся ў Савецкім Саюзе»

*ЗНАЁМЦЕСЯ: СТУДЭНТ ІІ КУРСА ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА АДДЗЯЛЕННЯ ПАЛІТЭКАНОМІІ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА САНЭСАВАН КАНІТХА. ЯМУ 23 ГАДЫ. ПАСЛЯ ЗАКАНЧЭННЯ СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ Ў В'ЕНЦЬЯНЕ ЁН БЫЎ НАКІРАВАНЫ НА ВУЧОБУ Ў САВЕЦКІ САЮЗ.*

(Заканчэнне на 2-й стар.).

## газета выступіла. Што зроблена?

### «Вячэрнія дзядзькі» і іншыя дробязі

НА АРТЫКУЛ «ВЯЧЭРНІЯ ДЗЯДЗЬКІ» І ІНШЫЯ ДРОБЯЗІ», ЗМЕШЧАНЫ Ў № 14 АД 16 КРАСАВІКА 1987 ГОДА, АДКАЗВАЕ ПРАРЭКТАР ПА АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЙ ЧАСТЦЫ У. І. ТАРАСЕВІЧ. (НАПОМНІМ, ГАВОРКА Ў ІМ ІШЛА ПРА БЫТ У ІНТЭРНАЦЕ № 4).

«...паведамляем, што ў цяперашні час у інтэрнаце ажыццяўляецца рамонт сіламі рамонтна-будаўнічага ўпраўлення № 13 Цэнтральнага раёна.

Згодна дагаворных умоў рамонт павінен быць закончаны ў першым паўгоддзі гэтага года. Аднак рамонт праводзіцца вельмі нездавальняюча, нягледзячы на меры, якія прымае адміністрацыя універсітэта. Да рамонту падвальнага памяшкання прыступілі, але тэрміны яго заканчэння невядомы. У падвале плануецца рэканструкцыя душавых, памывачнай, мармуровай і спартыўнай залы. У інтэрнаце адбудзецца пашыраная планёрка з прадстаўнікамі РБУ, на якой будуць удакладнены тэрміны заканчэння рамонтных работ.

Выхаваўчая работа, культурна-масавыя і спартыўныя мерапрыемствы павінны праводзіцца па планах грамадскіх арганізацый і савета інтэрната і ў арганізацыі такіх мерапрыемстваў студэнтам ніхто не адмаўляе».

## «студэнцкая вясна»

ШТОГОД ЗБІРАЕ «СТУДЭНЦКАЯ ВЯСНА» УДЗЕЛЬНІКАЎ І АМАТАРАЎ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ УНІВЕРСІТЭТА. НАШ ТРАДЫЦЫЙНЫ ФЕСТЫВАЛЬ СЁЛЕТА ПРАХОДЗІЎ ПАД ДЭВІЗАМ «РАДЗІМЕ КАСТРЫЧНІКА — МАЙСТЭРСТВА І ПОШУК МАЛАДЫХ!» І БЫЎ ПРЫСВЕЧАНЫ 70-ГОДДЗЮ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА.

# ТВОРЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ЁСЦЬ!

АГЛЯД-КОНКУРС мастацкай самадзейнасці завершаны. Падведзены вынікі, вызначаны пераможцы. Вынікі аказаліся непрадказальнымі. Што аказала уплыў на ход агляду, на мастацкі ўзровень конкурсных праграм факультэтаў — сказаць цяжка. Можа дэвіз конкурсу, ці ацэначная сістэма, а можа — рамкі правядзення і ўмовы выступленняў факультэтаў. Што б там ні было, але конкурс сёлета атрымаўся цікавейшы, чым у мінулым годзе.

Упершыню ў лік прызёраў увайшлі юрыдычны і філалагічны факультэты. І па заслугах! Канцэрты гэтых факультэтаў адрознівалі нетрадыцыйнасць, наяўнасць асабістага «твару», характару. Адчувалася, што студэнты, рыхтуючы канцэрты, аддавалі ім сябе цалкам. Важную ролю ў станаўленні самадзейнага мастацтва на юрыдычным факультэце, думаю, адыграў клуб «Верасень» (прэзідэнт клуба Андрэй Бурдыка).

Парадавала выступленне і геаграфаў. Тут таксама карыстаецца папулярнасцю студэнцкі клуб «Пятніца» (прэзідэнт Ігар Вараб'ёў).

Сярод сюрпрызаў конкурсу хачу назваць яшчэ адзін (праўда, далёка яму да прыемнага). Гэта — вечар інтэрнацыянальнай дружбы на фізічным факультэце. Факультэт, які заўсёды вызначаўся добрымі вакалістамі (амаль палова народнай харавой капэлы універсітэта — студэнты фізфака), на гэты раз абмежаваўся толькі ...выкананнем украінскай песні «Ты ж мэне підманула»...

Светлымі, святочнымі былі выступленні філалагічнага, механіка-матэматычнага, хімічнага факультэтаў, факультэтаў журналістыкі і прыкладной матэматыкі. Канцэрты факультэты паказалі ў рамках сваіх Дзён і ад гэтага, зразумела, толькі выйгралі.

Аналізуючы праграмы, хочацца адзначыць хоры філфака і журфака. І не толькі таму, што гэта масавыя калектывы (умовы конкурсу гэтага факта не прадугледжвалі), а іменна таму, што харавыя спевы — самыя дэмакратычныя ў музыцы. Спевы калектывам, разам збліжаюць людзей. А калі пяюць яшчэ шматгалосна і чыста, як на гэтых факультэтах, то бачыш, які творчы патэнцыял у нашых студэнтаў.

Парадавала і тое, што было закранута шмат студэнцкіх тэм. Іх раскрывалі тэатры мініяцюр, драмкалектывы і агітбрыгады. Гэта сведчыць пра папулярнасць тэатральнага жанру ў студэнцкім асяроддзі. Цікавыя праграмы паказалі драмкалектывы юрфака, СТЭМы хімфака, гістфака, агітбрыгады ММФ, філфака, ФПМ.

Журы адзначыла чытальнікаў: Святлану Банцэвіч і Сяргея Глебава (філалагічны факультэт), Амара Амарада (журфак). Доўга заставалася журы пад уражаннем маналога Раскольнікава, які прачытала В. Емяльянава (хімфак). Нельга не сказаць аб незвычайна пранікнёным выкананні песень Саідам Ісламі і дуэтам І. Капусцінай і А. Гамыляева (журфак), М. Мельнікавай (філфак), І. Фокінай (мехмат). Не важна, на якой мове спяваецца песня, важна, каб у ёй была душа.

Не зусім так, як маглі і як хацелася б, паказалі сябе сёлета ў мастацкай самадзейнасці гістарычны факультэт і факультэт радыёфізікі і электронікі... На жаль, не змаглі яны паказаць, якім павінен быць канцэрт, дастойны конкурсу. Будзем спадзявацца, што такія канцэрты не ўвойдуць у прывычку, а жаданне быць лепш за іншых возьме верх над інертнасцю і вяласцю. Думаю, што іменна гэта жаданне — стаць лепшым і вывела ФПМ з цяжкаватага становішча, традыцыйнага адзінаццатага месца — на чацвёртае. Можам шчыра пажадаць факультэту новых творчых пошукаў.

Пройдзе трошкі часу і з памяці вытруцца гарачыя спрэчкі, якія адбываліся пры абмеркаванні ўмоў агляду, забудзецца радасць перамог і горыч пройгрышаў. Але застанецца нязменным пытанне «Якой быць «Студэнцкай вясне-88»?

М. ТАРАСАВА,
мастацкі кіраўнік універсітэцкага студклуба, член журы.

**30 МАЯ Ў МІНСКУ АДБЫЛАСЯ ШОСТАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР АДЗІНАЦЦАТАГА СКЛІКАННЯ.**

**З ДАКЛАДАМ «АБ РАБОЦЕ КАМІСІІ ПА СПРАВАХ МОЛАДЗІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР» ВЫСТУПІЎ ЯЕ СТАРШЫНЯ ДЭПУТАТ Л. І. КІСЯЛЕЎСКІ.**

# АБ РАБОЦЕ КАМІСІІ ПА СПРАВАХ МОЛАДЗІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

Камісія па справах моладзі Вярхоўнага Савета БССР будуе сваю работу з улікам арыенціраў партыі на паглыбленне дэмакратызму савецкага ладу, больш актыўны ўдзел народа ў вырашэнні ўсіх пытанняў жыцця краіны. Цяпер, ва ўмовах актыўнай сацыяльнай палітыкі нашай партыі і дзяржавы адкрыліся новыя магчымасці для таго, каб зрабіць жыццё моладзі багацейшым, цікавейшым, больш змястоўным. Яе трэба актыўней прыцягваць да вырашэння задач перабудовы, паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця, ствараць неабходныя ўмовы, якія садзейнічалі б найбольш поўнай рэалізацыі яе творчага і працоўнага патэнцыялу.

Вывучэнне камісіяй становішча спраў паказвае, што ў гэтым плане работа актывізуецца. Развіваецца сетка камсамольска-маладзёжных калектываў на ўсіх адказных участках вытворчасці. Юнакі і дзяўчаты ўсё больш уцягваюцца ў вырашэнне задач паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу. Аднак неабходна прызнаць, што яны яшчэ недастаткова прыцягваюцца да кіравання вытворчасцю, слаба удзельнічаюць у распрацоўцы планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця.

У стварэнні ўмоў для масавага ўдзелу моладзі ў працэсе абнаўлення і дэмакратызацыі грамадства, вырашэння сацыяльна-эканамічных задач важнейшая роля належыць Саветам народных дэпутатаў і іх органам, у прыватнасці, пастаянным камісіям, якія ў апошні час актывізавалі сваю дзейнасць.

У саставе Пастаяннай камісіі па справах моладзі Вярхоўнага Савета БССР цяперашняга склікання 23 дэпутаты. Сярод іх — рабочыя і калгаснікі, настаўнікі і студэнты, работнікі партыйных і савецкіх органаў. Восем дэпутатаў — ва ўзросце да 30 гадоў. Гэта дае магчымасць кваліфікавана разглядаць пытанні, якімі займаецца камісія. Для больш глыбокага і ўсебаковага аналізу праблем, звязаных з моладдзю, практыкуецца вывучэнне і разгляд пытанняў сумесна з іншымі галіновымі камісіямі.

Стварэнне належных умоў для працы, быту і адпачынку моладзі з'яўляецца галоўнай задачай. З улікам гэтага камісія вывучыла работу выканаўчага камітэта Першамайскага раённага Савета народных дэпутатаў горада Мінска па паляпшэнню бытавых умоў і выхаваўчай работы ў маладзёжных інтэрнатах. Было ўстаноўлена, што ў гэтым раёне далёка не ва ўсіх інтэрнатах створаны нармальныя жыллёва-бытавыя ўмовы. Рад інтэрнатаў патрабуе тэрміновага капітальнага рамонту, замены ўстарэлай мэблі, абсталявання. Несвоечасова праводзіцца бягучы і прафілактычны рамонт. Выканком раённага Савета не прад'яўляе належнай патрабавальнасці да гаспадарчых кіраўнікоў за стан матэрыяльнай базы інтэрнатаў.

Дэпутаты ўказалі таксама на сур'ёзныя недапрацоўкі ў арганізацыі і правядзенні выхаваўчай работы, адсутнасць у ёй сістэмнасці і мэтанакіраванасці.

Няўвага да хвалюючых юнакоў і дзяўчат сацыяльных і духоўных праблем стала вынікам адмоўных з'яў у іх радах. Таму самую пільную ўвагу трэба звярнуць на стварэнне ўмоў для разумнага правядзення вольнага часу. Надаючы важнае значэнне практычнаму вырашэнню гэтага пытання на месцах, камісія вывучыла дзейнасць Саветаў народных дэпутатаў Ляхавіцкага раёна па далейшаму ўдасканаленню культурна-асветнай і фізкультурна-аздараўленчай работы сярод моладзі. Звернута ўвага Саветаў народных дэпутатаў раёна, іх выканаўчых камітэтаў на наяўнасць у гэтай справе сур'ёзных недахопаў і недапрацовак. Выконваючы рашэнне камісіі, яны папраўлі становішча спраў. Пытанні развіцця фізкультуры і спорту, арганізацыі адпачынку моладзі атрымалі адлюстраванне ў планах эканамічнага і сацыяльнага развіцця раёна, сельсаветаў і прадпрыемстваў.

Адна з важнейшых асноў нашага грамадства — здаровая і моцная сям'я. У ёй чалавек атрымлівае першыя ўрокі маральнай, ідэйна-палітычнай і працоўнай загартоўкі. У рэспубліцы штогод утвараецца амаль 100 тысяч новых сем'яў. У той жа час кожная трэцяя з іх распадаецца. Прычыны розныя. Аднак нельга не бачыць лёгкадумных адносін часткі маладых людзей да шлюбу, непадрыхтаванасць іх да сямейнага жыцця.

У красавіку бягучага года пасля ўсебаковага вывучэння камісія па справах моладзі сумесна з камісіяй па пытаннях працы і быту жанчын, аховы мацярынства і дзяцінства разгледзела пытанне аб рабоце, праводзімай у горадзе Пінску па захаванню патрабаванняў заканадаўства аб умацаванні сям'і і павышэнні яе адказнасці за выхаванне дзяцей.

У ходзе праверкі ўстаноўлена, што выканком гарадскога Савета яшчэ слаба ўздзейнічае на ўмацаванне сям'і, павышэнне яе адказнасці за выхаванне дзяцей. Гэтыя пытанні рэдка абмяркоўваюцца на пасяджэннях выканкома, пастаянных камісій, у працоўных калектывах.

Ва ўмовах высокай занятасці жанчын у грамадскай вытворчасці не ўсе кіраўнікі прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў ажыццяўляюць у поўным аб'ёме прадугледжаныя заканадаўствам меры па паляпшэнню ўмоў працы і быту, аховы здароўя работніц, стварэнню спрыяльных магчымасцей для спалучэння імі мацярынства з вытворчай і грамадскай дзейнасцю. На пачатак бягучага года ў горадзе Пінску каля 10 тысяч жанчын працуюць ва ўмовах, якія не адпавядаюць патрабаванням аховы працы. Яны складаюць каля 46 працэнтаў усіх занятых у начных зменах. Практычна не выкарыстоўваецца рэжым работы з няпоўным рабочым тыднем і няпоўным рабочым днём.

Многія сем'і ў Пінску не могуць уладкаваць сваіх дзяцей у дашкольныя ўстановы. У чарзе на атрыманне месца ў дзіцячых садах і яслях стаяць каля 1500 сем'яў. Мала ўвагі ўдзяляецца паляпшэнню жыллёвых умоў маладых сем'яў. Распаўсюджаны характар носяць п'янства і алкагалізм, якія з'яўляюцца асноўнай прычынай разводаў і росту колькасці няпоўных сем'яў.

Члены камісіі прыйшлі да вываду, што выканком гарадскога Савета недастаткова каардынуе намаганні ўстаноў народнай асветы, культуры, аховы здароўя, праваахоўных органаў, грамадскіх арганізацый па ўмацаванню сям'і, не прад'яўляе належнай патрабавальнасці да гаспадарчых кіраўнікоў за вырашэнне сацыяльна-бытавых пытанняў. Аналагічныя недахопы характэрны і для іншых гарадоў і раёнаў нашай рэспублікі.

Камісія рэкамендавала Міністэрству аховы здароўя БССР і Міністэрству юстыцыі БССР сумесна з выканаўчымі камітэтамі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў завяршыць да 1 ліпеня бягучага года стварэнне ў кожным раёне кансультацыйных пунктаў для ўступаючых у шлюб і актывізаваць работу наяўных. Міністэрству асветы БССР рэкамендавана резгледзець пытанне аб падрыхтоўцы ў педагагічных ВНУ рэспублікі выкладчыкаў курса «Этыка і псіхалогія сямейнага жыцця».

У полі зроку камісіі знаходзяцца праблемы навучання, выхавання і працоўнай падрыхтоўкі навучэнскай моладзі. На сумесным пасяджэнні з камісіяй па народнай асвеце і культуры прааналізавана работа Аршанскага гарадскога Савета народных дэпутатаў па ажыццяўленню рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы. Дэпутаты ўказвалі, што выканком гарсавета недастаткова ажыццяўляе кантроль і каардынацыю работы па карэннаму паляпшэнню працоўнага навучання, выхавання і прафесіянальнай арыентацыі навучэнцаў. Штогод не выконваецца план па камплектаванню прафтэхвучылішчаў. Не прад'яўляецца належнай патрабавальнасці да кіраўнікоў базавых прадпрыемстваў, па чыёй віне школы і ПТВ слаба забяспечаны сучаснай тэхнікай і абсталяваннем. Педагагічныя калектывы не праяўляюць настойлівасці і рашучасці ў пераадоленні старых, зжыўшых сябе форм і метадаў работы. Не лепшае становішча і ў іншых гарадах і раёнах рэспублікі.

Па-ранейшаму аказваецца малападрыхтаванай да прадукцыйнай грамадскай працы школьная моладзь. Многія гаспадарчыя кіраўнікі не спяшаюцца падключыцца да арганізацыі працы падлеткаў, а мясцовыя Саветы не нацэльваюць іх на гэта. Тармозіцца справа і ў вышэйшых органах кіравання. Напрыклад, штогод летам тысячы 15—16-гадовых падлеткаў працуюць на трактарах і камбайнах, і ў той жа час да гэтай пары няма дазволу кампетэнтных органаў аб зніжэнні ўзроставай мяжы, якая б давала права самастойна працаваць на тэхніцы.

Міністэрствам і ведамствам, Саветам народных дэпутатаў, органам народнай асветы неабходна больш настойліва і аператыўна, з улікам канкрэтных умоў і магчымасцей ажыццяўляць патрабаванні рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы па кардынальнаму павышэнню якасці навучання і выхавання падрастаючага пакалення, падрыхтоўцы свядомых, высокаадукаваных людзей, гатовых да самастойнага жыцця і працы.

Крытычна ацэньваючы работу камісіі па справах моладзі Вярхоўнага Савета БССР, трэба прызнаць, што яна яшчэ не ў поўнай меры выкарыстоўвае прадастаўленыя ёй правы. Не ўсе дэпутаты, члены камісіі актыўна ўдзельнічаюць у вывучэнні і абмеркаванні пытанняў, выпрацоўцы рэкамендацый, арганізацыі іх выканання.

Камісія бачыць сваю задачу ў тым, каб, карыстаючыся данымі ёй правамі, дзейнічаючы ўласцівымі ёй метадамі работы, усямерна садзейнічаць вырашэнню пытанняў выхавання, адукацыі, прафесіянальнага навучання, паляпшэння арганізацыі працы, быту, адпачынку і аховы здароўя моладзі, забеспячэння яе правоў і інтарэсаў, удзелу ў дзяржаўным, гаспадарчым і сацыяльна-культурным будаўніцтве. Неабходна ўзмацніць увагу да пытанняў выхавання юнакоў і дзяўчат у духу савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму, паляпшэння маральна-палітычнай, ваенна-тэхнічнай і фізічнай падрыхтоўкі дапрызыўнай моладзі, фарміравання ў яе пачуцця высокай адказнасці за выкананне ганаровага абавязку па абароне сацыялістычнай Айчыны.

мы — інтэрнацыяналісты

# «Я вучуся ў Савецкім Саюзе»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

ЛАОС — БІРМА, Бірма — Індыя, Індыя — Савецкі Саюз... Усё бягом: перасадкі, разгрузкі, рэгістрацыі, не паспяваеш нічога разгледзець, нават спакойна ўздыхнуць... Нарэшце колы заміраюць: за акном — Кіеўскі вакзал. Прыехалі.

— Першае, што мяне вельмі здзівіла, калі я сышоў на перон,— гэта высокія прыгожыя будынкі, шырокія тратуары, вялікая колькасць трамваяў (раней я іх ніколі не бачыў) і, зразумела, самі людзі, вельмі эмацыянальныя. А потым я даведаўся, што ў адным Кіеве жыве прыблізна столькі чалавек, колькі ва ўсёй маёй краіне. Для мяне была вельмі новай і нязвыклай гэта атмасфера вялікага горада, не падобная на жыццё «аднапавярховага» В'енцьяна.

Але нядоўга заставаўся ён у Кіеве. Санэсаван — добры футбаліст, марыў паступіць у інстытут фізкультуры, павучыцца ў вядомых савецкіх майстроў. Глядзіш, і прыйдзе час, калі змогуць сустрэцца на футбольным полі дзве каманды: СССР і Лаоса. Але краіна чакае найперш спецыялістаў у галіне палітэканоміі, футбол жа будзе ўздымаць хто-небудзь іншы. А Санэсаван паступіў у Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна.

— Я ведаю, што прыехаў у Савецкі Саюз не як цікаўны турыст ці бяздзейны падарожнік, а як прадстаўнік сваёй краіны са спецыяльным заданнем — вучыцца. Гэта мяне да многага абавязвала, трэба было ўключацца ў новае жыццё, авалодваць навукамі.

Цяжка было, цяжка і цяпер, тры гады апасля. Уяўляеце, адзін, далёка ад радзімы, без ведання мовы, у незнаёмай краіне. Кнігі пра Савецкі Саюз я чытаў, але кніжныя ўражанні — адно, а жыць тут, вучыцца — зусім іншае. У школе я вучыў в'етнамскую мову, акрамя роднай. Рускай не ведаў абсалютна — гэта было не на маю карысць. Першапачаткова, сумленна гаворачы, адчуваў сябе як іншапланецянін. Ды яшчэ лекцыі і падручнікі на рускай мове, у інтэрнаце самі студэнты мовай інтэрнацыянальных зносін выбралі рускую. Спачатку я абыходзіўся пры дапамозе лаоска-рускага слоўніка,



але насіць яго ўвесь час пад пахай было нязручна. Сур'ёзна ўзяўся за мову. Здавалася, што рускія — гаваруны і гавораць вельмі шпарка. Асобныя гукі вашай мовы проста не існуюць у лао. Я, як ні стараўся, не мог іх вымаўляць — мяне не разумелі, хаця самому мне здавалася, што я дамогся пэўных поспехаў. Але самае цяжкае мінула, і вялікая заслуга ў гэтым — вопытных выкладчыкаў моўных курсаў пры універсітэце. Гадзінамі нам «удзёўбвалі» граматыку, займаліся з кожным індывідуальна... Вынік відавочны — ужо магу хадзіць у кінатэатры, чытаць літаратуру, слухаць радыё — перыяд акліматызацыі прайшоў нармальна.

У Мінску ўсяго вучыцца 95 лаоскіх студэнтаў. Гэта значыць, што Лаос атрымае хутка вопытных спецыялістаў у розных галінах: педагогіцы, медыцыне, сельскай гаспадарцы... Землякам заўсёды ёсць пра што пагутарыць: успомніць радзіму, падзяліцца планамі. Ёсць і старшыня зямляцтва — Буцьян. Месца сустрэч — інтэрнат № 5 універсітэта. Часты госць там і Санэсаван.

— Мы разам сустракаем нацыянальныя святы, праводзім вечары, наведалі ВДНГ Беларусі, але асабліва мне запомнілася паездка ў Хатынь. Гэта маленькая вёсачка пад Мінскам сказала мне пра многае, і пра галоўнае — берагчы мір.

Ва ўсім універсітэце я адзін студэнт з Лаоса. Разумею, што мая вучоба — гэта не толькі мая асабістая справа, таму імкнуся добра вучыцца. Я заўважыў, што сістэма адукацыі тут асаблівая, не такая, як у нас: вучэбныя планы большыя, патрабаванні педагогаў вышэй, уважлівыя адносіны да студэнта — ніхто не застанецца незаўважаным. Выкладчыкі прапануюць нам, замежнікам, сваю дапамогу, назначаюць дадатковыя заняткі. Я, напрыклад, вельмі задаволены, што вучуся ў СССР. І мне здаецца, што для нас, маладых лаосцаў, якія маюць пакуль толькі дзве вышэйшыя навучальныя ўстановы (педагагічны і мединстытут), вучоба ў Саюзе — шчаслівая магчымасць. У нашым распараджэнні абсталяваныя тэхнікай кабінеты і лабараторыі, бібліятэкі — толькі вучыся.

У Санэсавана — сесія, таму няшмат у яго цяпер свабоднага часу. А потым — летнія канікулы. Санэсаван збіраецца паехаць у студэнцкі будатрад. Гэта яму ўжо не ўпершыню: у мінулым годзе ён разам з атрадам працаваў у Іркуцкай вобласці.

Утульны пакой інтэрната, іграе любімы савецкі ансамбль «Яблыка». На сценах — фотакарткі зорак футбола, і сярод іх — ігракі мінскага «Дынама», бо Санэсаван цяпер яго заўзяты балельшчык.

— У мяне цяпер вельмі шмат сяброў. Вось мае суседзі па пакою: в'етнамец Гнуен Гног Куен і беларус Саша Казакоў. Мы цудоўна разумеем адзін аднаго. У групе ў мяне таксама ёсць сябар — узбек Бунжуан Кандбекаў. Ен дапамагае мне ў вучобе, мы разам гуляем у футбол, валейбол, сустракаем святы. Бунжуан усё зайздросціць мне: маўляў, у два разы болей святаў, чым у яго — савецкія плюс нацыянальныя лаоскія.

Ва універсітэце Санэсаван атрымлівае стыпендыю — 90 рублёў. Палова ідзе на харчаванне, гатуе ён сам.

— Спачатку ніяк не мог прывыкнуць да хлеба і малака — у нас яны зусім іншыя па смаку. А рускія пельмені, якія ў Лаосе, напэўна, ніхто і не спрабаваў, сталі маёй любімай стравай. Іншы раз мы ў інтэрнаце робім нешта накшталт спаборніцтваў. Я гатую якую-небудзь страву з лаоскай кухні, Саша — з беларускай (звычайна заўсёды з бульбай).

У хуткім часе спадзяюся на сустрэчу з братам — ён таксама вучыцца ў Савецкім Саюзе, заканчвае Харкаўскі будаўнічы інстытут. Будзем сустракаць малодшую сястру. Яна хоча паступіць у педагагічны. Вы спытайце ў яе гады праз два, ці здзейснілася яе мара? Я ўпэўнены, што яна адкажа таксама, як і я: «Так, я вучуся ў Савецкім Саюзе.

Н. КРАПІЎНАЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі.
Фота Т. ХАМІЦЭВІЧ.

*на рынг!*

# АНТЫ*брава*

*нататкі з галёркі*

— Барабан?!

— Раз, два, тры...

— Увесь горад аблазіў, каб памыцца. Знайшоў баню на Маскоўскай. Ды і там, стоячы ў чарзе, можна няблага выпарыцца...

— Трэба было падручнік узяць, да палітэканоміі рыхтавацца...

— Пакуль чарга надышла, вада і скончылася...

— Гітара, гітара, не чую...

— Калі ж, нарэшце, марынаваць перастануць?

Фактычна такімі рэплікамі быў насычаны пачатак маладзёжнага вечара «Пагаворым пра музыку», які павінен быў адбыцца 20 мая ў Палацы культуры чыгуначнікаў.

Роўна ў 18.00 беглі да палаца апошнія, хто спазніўся. Не ведалі яны яшчэ, што сустрэнуцца са знаёмымі, пагутараць пра надвор'е, футбол і г. д., пра ўсё, што дапамагае бавіць час, калі раптам па нейчай задумцы (віне, недагляду?) яго аказваецца залішне шмат. А мо калі ў запрашэнні ад імя камітэта камсамола, клуба «Эксперымент» Белдзяржуніверсітэта надрукавана «Пачатак — у 18.00», гэта зусім не значыць, што нельга гаварыць пра музыку, стоячы ў вестыбюлі бітую гадзіну, замест сустрэчы з рок-групамі «Блізняты», «7 герц», «Хой», дуэтам з МРТІ там, у канцэртнай зале? А там, за шчыльна зачыненымі дзвярыма ішла тым часам не то рэпетыцыя, не то настройка апаратуры, не то яшчэ што — заставалася толькі гадаць і не разумець.

Нарэшце а пачатку восьмай гадзіны, калі ўсе ўжо з даволі сапсаваным настроем расселіся па крэслах, на сцэне з'явіўся нехта (распараджальнік?) і безапеляцыйна абвясціў:

— Пакуль не перастануць падпіраць сценкі, канцэрт не пачнецца. (На ўсіх аматараў беларускай рок-музыкі не хапіла месц).

Балазе, строгі мужчына пагрозу не прывёў у дзеянне.

Вядучыя выйшлі з пышным букетам прабачэнняў за незапланаванае спазненне. Забягаючы наперад, скажу, што аднаго букета на ўвесь вечар не хапіла, гэта быў толькі першы.

Букет № 2 прапанавалі нам за некаторыя вымушаныя змяненні. Справа ў тым, што першапачаткова была задумка зрабіць не проста трывіяльны канцэрт, а нешта ў духу часу, арыгінальнае, непасрэднае, і нават не канцэрт, а — «музычны рынг»! Назва да таго ж гучная, новая, модная, інтрыгуючая. Галоўнае, меркавалася, што такая форма зробіць уплыў і на змест. Уявіце: вы маеце магчымасць задаць любое пытанне, а вам на гэта — шчыры адказ «з першых вуснаў» ад самога выканаўцы. І, зразумела, як у хуткай плыні нараджаюцца віры, так і на працягу вечара маглі з'явіцца нечаканыя спрэчкі, нават дыскусіі і г. д. Не мне вам расказваць, якім можа быць музычны рынг,— ленінградскае тэлебачанне дае аб ім добрае ўяўленне.

Згадзіцеся, задумка сама па сабе нядрэнная. І можа не трэба іранізаваць, зводзячы да вываду, што, даганяючы моду, рызыкуеш даць прыклад, як не трэба апранацца?

Па тэхнічных (аб'ектыўных, уважлівых?) прычынах свабодны мікрафон у зале, са слоў вядучых, «усталяваць не ўдалося».

Што ж, мы людзі, мікрафонам не пешчаныя, можам і да традыцыйных запісак звярнуцца, пішучы іх у цемры, можам і з месца крыкнуць. Студэнты — народ не фанабэрысты: чым прасцей — тым лепш.

Трэці букет прабачэнняў быў паднесены за дрэнна настроеную апаратуру, стан якой залежыць, зразумела, ад «тэхнічных прычын».

Атрымалася так, што гэтыя самыя «тэхнічныя прычыны» і сталі самым галоўным праціўнікам як музыкантаў, так і слухачоў.

«Першы раунд» выпала выстаяць добра вядомаму беларускай моладзі ансамблю «Блізняты». Не ведаю, ад чаго, а ў мяне склалася ўражанне, што ці ансамбль занадта захвалілі, ці не вытрымаў ён раунда з дрэнна настроенай апаратурай, а толькі малавыразным было яго выступленне.

І прыйшло яшчэ адно параўнанне: вечар наш — карабель, упершыню спушчаны на ваду, пабудаваны няўмекамі па эскізах некалі бачаных малюнкаў. Нашармака. Без руля і ветразяў. Рыпіць карабель, хілячыся на бок, па швах разыходзіцца. «Нашармака» — не атрымліваецца.

З сумам канстатавалі і вядучыя: «Адчуваецца, рынг не атрымліваецца...» Але была яшчэ ў іх кропля аптымізму (якая выпарвалася на вачах): «Будзем лічыць, што мэтай нашага канцэрта з'яўляецца знаёмства з разнастайнымі напрамкамі беларускай рок-музыкі, якія прадстаўляюць самадзейныя выканаўцы» (з-пад даху рок-клуба «Няміга»).

На непрацяглы час выправіць становішча ўдалося дуэту з Мінскага радыётэхнічнага інстытута, нягледзячы на тое, што аўдыторыя спачатку іх не вельмі жадала прымаць, нават абсвістала.

— Бедненькія, трэба іх падтрымаць,— пачулася ззаду ад спачувальных студэнтак, і яны дружна ўтрох запляскалі ў далоні.

А «бедненькім» наўрад ці была патрэбна паблажка. Няякасна загучалі гітары, няроўна пачалася песня, а мы — аказаліся ў палоне паэтычнасці, глыбіні, вобразнасці, эмацыянальнасці, тонкасці, з якіх нібыта былі выткана і ўсе астатнія іх творы.

Андрэй Шаламінцаў і Яўген Жыдовіч разам ужо пяць гадоў. З першага курса яны з'яўляюцца гонарам інстытута. Тэксты і мелодыі прыдумваюць сумесна. І вельмі-вельмі добра ў іх гэта атрымліваецца.

Скрозь гучныя апладысменты прарвалася ацэнка залы:

— Малаток!

Што вы ведаеце пра класічны хард-рок? Калі няшмат, дык вядучы дапаможа папоўніць вашы веды, пакуль ідуць прыгатаванні групы «Хой». Адначасова вядучы настройвае нас на нешта цікавае. Сам экзальтаваны выгляд «Хой», іх вольныя паводзіны («Міша, дзе зялёная штука?» — бесцырымонна пытае ў мікрафон музыкант некага), перакрыжаваная размова з залай — падрыхтавалі публіку да цёплага прыёму.

Апаратура спрабуецца. Спрабуюць, забраўшыся ў верхні рэгістр, свае галасавыя звязкі вакалісты. Вось і ўсё. Падрыхтоўка так і засталася ёй, не ператварыўшыся ў наступны, належны этап. «Хой» адмовілася пачаць раунд і знікла за кулісамі.

Ці не ў тэатр абсурду мы трапілі?

Маленькі букет № 4 прабачэнняў датычаў таго, што замест чакаемай многімі групы «7 герц» («Я толькі дзеля яе прыйшоў, а ў іх захварэў вакаліст»,— прашаптаў мне на вуха прыхільнік хэві-метал) выступіць група «Полюс».

Ну, «Полюс» дык «Полюс».

— А хэві-метал усё роўна давай!

Далі. Упэўнена, энергічна, публіцы яны відавочна сімпатызавалі. Хочацца спадзявацца, што



музычныя крытыкі яшчэ скажуць пра групу сваё слова.

Але не магу не спыніцца на непрыемна ўразіўшых мяне момантах.

Пяць гадоў назад прадстаўнік прэсы, пабываўшы на канцэрце «Цветов» (памятаеце яшчэ такую групу?), абурыўся наконт іх выгляду і паводзін на сцэне. Ён пісаў:

«...Не, не, красоўкі на працягу канцэрта застаюцца проста непераборлівым абуткам і не болей таго. Зразумела, калі такія «антыкасцюмы» выкарыстоўваліся ў сярэдзіне 70-х гадоў некаторымі заходнімі рок-групамі, якія выступалі з бунтарскіх пазіцый. Там такія элементы адзення неслі пэўную ідэйную накіраванасць».

Смешна? (Нават калі не звяртаць увагі на стылістычныя памылкі). Як пяць гадоў назад, так тым больш і цяпер. Нам, моладзі, здаецца недарэчным звяртаць увагу на тое, як апрануты такія ж маладыя, як і мы, нават калі яны і артысты. Цяпер трохі не той час, калі ў тэатр ці канцэртную залу абавязкова патрэбна было апранацца ў лепшае і святочнае. Не ў гэтым галоўнае. А вось пра тое, як паводзяць сябе на сцэне тыя, да каго мы прыйшлі,— пра гэта трэба гаварыць. Бо ёсць грань, калі проста вольныя паводзіны ператвараюцца ў развязныя, ад якіх аддае непадробным хамствам, знявагай.

Яфімаў («кіраўнік, музыкант, вакаліст, паэт» — так аб'явілі яго публіцы) чытаў нашы запіскі:

— Гэтая запісачка не нам. Таксама не да нас. І гэта. Тут — нейкая брыдота,— і кідаў адну за адной на падлогу.

— А вось гэта — да нас. Па вашых просьбах выконваем песню «Невядомы салдат»,— рука апусцілася...

...Незадаволенымі разыходзіліся і гледачы («Грошы вяртай!» — не раз чулася ў цемры залы. «Якая дрэнная арганізацыя!» — не стамляліся паўтараць побач ); і музыканты былі не ў настроі (згадзіцеся, для пачынаючых кожная сустрэча з аўдыторыяй — новая прыступка на шляху прызнання і станаўлення); і, зразумела, невясёлымі былі твары арганізатараў (размах — на рубель, удар — на капейку. Які пасаж!).

Карабель неяк усё ж дацягнуў да берага. Але ўяўляў ён сабой незайздроснае відовішча.

А. ВІХРОВА.
Наш кар.

*да 70-годдзя Вялікага Кастрычніка*

У АДПАВЕДНАСЦІ З ПАСТАНОВАЙ ЦК ВКП(б) АД 9 ЖНІЎНЯ 1944 ГОДА «АБ БЛІЖЭЙШЫХ ЗАДАЧАХ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ КП(б) БЕЛАРУСІ Ў ГАЛІНЕ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЙ І КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЙ РАБОТЫ СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА» ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ КВАЛІФІКАВАНЫХ РАБОТНІКАЎ ДРУКУ ПРЫ БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ БЫЎ СТВОРАНЫ ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ.

ПЕРШЫЯ КРОКІ СВАЁЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЁН ЗРАБІЎ НА СТАНЦЫІ СХОДНЯ, ШТО КАЛЯ МАСКВЫ, ДЗЕ Ў ТОЙ ЧАС ЗНАХОДЗІЎСЯ УНІВЕРСІТЭТ. І ТОЛЬКІ ПАСЛЯ ВЫЗВАЛЕННЯ МІНСКА АД ГІТЛЕРАЎСКІХ АКУПАНТАЎ ЁН ПЕРАЕХАЎ У СТАЛІЦУ РЭСПУБЛІКІ.

З ТАГО ЧАСУ МІНУЛА ЗВЫШ 40 ГАДОЎ. ФАКУЛЬТЭТ НАБЫЎ ВЯЛІКІ ВОПЫТ У ПАДРЫХТОЎЦЫ ЖУРНАЛІСЦКІХ КАДРАЎ.

СЕННЯ МЫ ПАЧЫНАЕМ ПУБЛІКАЦЫЮ СТАРОНАК ДЗЕННІКА ДОКТАРА ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК, ПРАФЕСАРА РЫГОРА ВАСІЛЬЕВІЧА БУЛАЦКАГА. ЗВЫШ ЧВЭРЦІ СТАГОДДЗЯ ЁН УЗНАЧАЛЬВАЎ СПАЧАТКУ АДДЗЯЛЕННЕ, А ПОТЫМ — ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ.

МАТЭРЫЯЛЫ ДЗЕННІКА І ПРЫКЛАДЗЕНЫЯ ДА ЯГО СТАРОНКІ З ПУБЛІКАЦЫЙ ГАЗЕТ АХОПЛІВАЮЦЬ ЗВЫШ 30 ГАДОЎ. З ІМІ, НА НАШУ ДУМКУ, БУДЗЕ ЦІКАВА ПАЗНАЁМІЦЦА І ВЫКЛАДЧЫКАМ, І СТУДЭНТАМ УНІВЕРСІТЭТА.

# ЛЕТАПІС СТАНАЎЛЕННЯ

**ВЕРАСЕНЬ, 1946 ГОД.** Пасля дэмабілізацыі з выпадку кантузіі на фронце я зноў адчыніў дзверы універсітэта, які гітлераўцы разбурылі дашчэнту. Захаваўся адносна цэлым толькі невялічкі корпус фізіка-матэматычнага факультэта. Уладкаваўся ў інтэрнаце, якім стаў былы корпус хімфака. У пакоі — звыш 20 жыхароў. Заняткі наведваем ўвечары. Займаемся ў будынку школы, што знаходзіцца непадалёку ад Юбілейнага рынка.

Амаль штодня працуем на аднаўленні разбуранага універсітэта. Паўгалоднае жыццё. Большая частка студэнтаў — былыя франтавікі і партызаны. Многія пакалечаныя, кантужаныя.

Акрамя голаду, яшчэ і холад. Увечары ходзім на вакзал, каб раздабыць дровы.

Першыя дзве сесіі здаў паспяхова. Часта езджу ў родную вёску: трэба дапамагаць круглым сіротам — дзецям маіх загінуўшых братоў. Нягледзячы на гэтыя клопаты, актыўна ўдзельнічаю ў грамадскім жыцці. Гэта для мяне — жыццёвая патрэба.

**ЛІПЕНЬ. 1947 ГОД.** IV курс паехаў на экскурсію ў Маскву. Будучыя журналісты былі гасцямі ў рэдакцыі газеты «Правда». Аб вопыце работы рэдакцыі расказвалі Д. Заслаўскі, Ю. Жукаў, Б. Палявы і іншыя. Наведалі музей і Маўзалей У. І. Леніна, Гістарычны музей, Траццякоўскую галерэю.

**КАСТРЫЧНІК, 1947 ГОД.** Напярэдадні 30-й гадавіны Вялікага Кастрычніка была апублікавана Пастанова ЦК КП(б)Б аб стварэнні ва універсітэце шматтыражнай газеты. Калектыў студэнтаў і выкладчыкаў аддзялення журналістыкі з вялікай радасцю сустрэў гэтую навіну — лепшай вучэбнай базы не трэба і жадаць. Першы нумар было вырашана выпусціць да свята Кастрычніка. Разам з рэдакцыяй на чале з аспірантам Л. С. Абецэдарскім над першым нумарам працавалі студэнты. У рэдакцыю даслалі свае артыкулы акадэмікі М. М. Нікольскі, У. М. Перцаў. Пачынаючы тады паэт Мікола Аўрамчык прынёс свой верш «Мы нарадзіліся пасля Кастрычніка». Аспірант Іван Мележ падрыхтаваў да друку ўрывак з рамана «Мінскі напрамак». Аддзел гумару падрыхтавалі таксама студэнты аддзялення.

**12 САКАВІКА, 1948 ГОД.** Створана аддзяленне студэнцкага навуковага таварыства. Яго членамі сталі 15 будучых журналістаў. Праз 10 дзён адбыўся творчы вечар студэнтаў-журналістаў і артыстаў тэатра імя Я. Купалы. Абмяркоўвалі пастаноўку п'есы «Губернатар правінцыі» братоў Тур. 16 красавіка сустрэліся з лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Максімам Танкам.

**СТУДЗЕНЬ, 1949 ГОД.** Студэнт V курса аддзялення журналістыкі В. Шыцік выступіў за горад Мінск у камандным першынстве Беларусі па шахматах. У сакавіку 1949 года студэнтка аддзялення Б. Шэрашэўская стала чэмпіёнкай рэспублікі па шашках. 22 сакавіка 1949 года камсамольцы III курса ўзялі шэфства над маладымі будаўнікамі Мінскага аўтамабільнага завода. У чым яно праяўлялася? Дапамагалі ў вучобе (многія з рабочых вучыліся ў сярэдняй школе), рыхтавалі аб іх нарысы і замалёўкі, моцна сябравалі. 23 красавіка пачалі праводзіць літаратурна-музычныя вечары на замежных мовах. Асабліва горача апладзіравалі студэнтцы І курса Ф. Трахтэберг, якая прачытала верш Э. Пацье «Каля сцяны». А як цікава прайшоў канцэрт мастацкай самадзейнасці ў падшэфным Дзяржынскім раёне!

**3 ЧЭРВЕНЯ, 1949 ГОД.** На аддзяленні — вялікая падзея! М. С. Зярніцкі абараніў кандыдацкую дысертацыю на званне кандыдата гістарычных навук. Першы кандыдат навук на аддзяленні, таму і віншаванні самыя гарачыя.

У гэтым жа месяцы адбыўся першы выпуск. Дыпломы аб заканчэнні атрымалі 11 чалавек. Што ні кажыце, вялікая ўрачыстасць! І першая кніга вершаў студэнта Міколы Аўрамчыка «Пярэдні край», што выйшла ў ліпені, таксама ўзрадавала ўсіх.

**1 ВЕРАСНЯ, 1949 ГОД.** Студэнты вярнуліся з практыкі. Новы вучэбны год. Шмат уражанняў. Першыя лекцыі І. В. Гугарава. На занятках усе — гэта ж наш кумір! Колькі вершаў ён ведае напамяць! Чытае з захапленнем. Слухаюць яго з вялікай увагай. А 16 кастрычніка адбыўся агульны сход камсамольскай арганізацыі. У новы састаў камітэта ўвайшлі ад нашага аддзялення студэнт III курса А. Качароўскі, адказным за сектар друку быў выбраны А. Зінін. 6 лістапада 1949 г. сваё першае апавяданне на старонках шматтыражнай газеты універсітэта надрукаваў М. Цікоцкі.

13 лістапада адбыўся агульнауніверсітэцкі студэнцкі прафсаюзны сход, на якім другі раз быў выбраны старшынёй прафкома універсітэта студэнт IV курса Р. Булацкі.

У канцы лістапада 1949 г. на кожным курсе пачалі выходзіць студэнцкія насценныя газеты.

**15 СНЕЖНЯ 1949 ГОДА** адбыўся справаздачна-выбарны сход партыйнай арганізацыі універсітэта, выбраны новы састаў парткома. Намеснікам сакратара стаў студэнт аддзялення Герой Савецкага Саюза А. Філімонаў, а членамі парткома — кандыдат гістарычных навук М. С. Зярніцкі і студэнт Р. Булацкі, старшыня прафкома.

(Працяг будзе).

